РАШЭННЕ
калегіі ўпраўлення культуры
Брэсцкага аблвыканкама
16 апреля 2024 г. № 7

г. Брэст

Аб выніках абласнога тура
XXXII рэспубліканскага конкурсу
«Бібліятэка – асяродак нацыянальнай
культуры»

На абласны тур XXXII рэспубліканскага конкурсу былі прадстаўлены 9 матэрыялаў ад наступных бібліятэк: Ганцавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя В. Ф. Праскурава ДУК «Ганцавіцкая РЦБС», Цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф. І. Панфёрава ДУК «ЦРБ імя Ф. І. Панфёрава» г. Іванава, Івацэвіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пестрака ДУК «Івацэвіцкая РБС», Ляхавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя Я. Купалы ДУК «Ляхавіцкая РЦБС», Маларыцкая цэнтральная раённая бібліятэка ДУК «Маларыцкая РЦБС», Столінская цэнтральная раённая бібліятэка ДУК «Столінская РБС», Перхавіцкая сельская бібліятэка ДУК «Баранавіцкая РЦБС», Яглевіцкая сельская бібліятэка ДУК «Івацэвіцкая РБС», Парахонская сельская бібліятэка ДУК «Пінская РЦБС».

Матэрыялы, якія былі прадстаўлены ў абласны аргкамітэт, уключалі: заяўку, інфармацыйную і аналітычную даведкі аб рабоце бібліятэк за апошнія тры гады, ксеракопію Статута ўстановы культуры, фотаздымкі работ, дадаткі ў выглядзе электронных рэсурсаў і баз дадзеных, інфармацыйна-бібліяграфічных і аналітычных матэрыялаў, рэкламнай і выдавецкай прадукцыі, сцэнарных і электронных матэрыялаў, прэзентацый, відэаролікаў і г.д.

Разгледзеўшы конкурсныя матэрыялы і заслухаўшы інфармацыю дырэктара Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага Стрыжэвіч А. Я., калегія ўпраўлення культуры ВЫРАШЫЛА:

1. Прызнаць пераможцамі абласнога тура XXXII рэспубліканскага конкурса «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»:

У намінацыі «За пошукавую і даследчую працу».

Сярод гарадскіх бібліятэк:

Ляхавіцкую цэнтральную раённую бібліятэку імя Я. Купалы ДУК «Ляхавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (дырэктар Пляшэвіч Вольга Анатольеўна) – I месца за высокі ўзровень пошукавай краязнаўчай дзейнасці па даследаванні матэрыялаў пра калгасы на тэрыторыі Ляхавіцкага раёна і стварэнне ўнікальнай электроннай базы даных «Зямля яднае і ўзбагачае: гісторыя сельскіх гаспадарак Ляхавіччыны»;

Цэнтральную раённую бібліятэку імя Ф. І. Панфёрава ДУК «Цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф. І. Панфёрава» г. Іванава (дырэктар

Данількевіч-Федарашка Алена Іванаўна) – II месца за плённую працу па збору, апрацоўцы, сістэматызацыі і папулярызацыі матэрыялаў пра Іванаўскі раён і распрацоўку электроннага краязнаўчага рэсурсу «От истоков к современности».

У намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы»:

Сярод гарадскіх бібліятэк:

Маларыцкую цэнтральную раённую бібліятэку ДУК «Маларыцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (дырэктара Кузьміцкая Наталля Аляксееўна) – I месца за інавацыйны падыход да фарміравання ў маладых людзей выверанай грамадскай пазіцыі ў адносінах падзей Другой сусветнай вайны і захаванне гістарычнай памяці праз стварэнне электроннага рэсурсу «Марш по дорогам памяти».

У намінацыі «За падтрымку і развіццё чытання».

Сярод гарадскіх бібліятэк:

Столінскую цэнтральную раённую бібліятэку ДУК «Столінская раённая бібліятэчная сістэма» (дырэктар Ляшкевіч Іван Пятровіч) – I месца за рознабаковую актыўную работу па прыцягненню да чытання і папулярызацыю пісьменнікаў-землякоў праз рэалізацыю літаратурна-краязнаўчага інтэрнэт-праекта «Паэтычная лаўка».

У намінацыі «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем».

Сярод гарадскіх бібліятэк:

Ганцавіцкую цэнтральную раённую бібліятэку імя В.Ф. Праскурава ДУК «Ганцавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (дырэктар Хваль Ала Уладзіміраўна) – I месца за актыўную і мэтанакіраваную работу па фарміраванні ў моладзі высокай сацыяльнай актыўнасці, грамадзянскасці і патрыятызму, пачуцця гонару за сваю Айчыну праз дзейнасць грамадска-патрыятычнага праекта «Як я стаў сабою».

Сярод сельскіх бібліятэк:

Парахонскую сельскую бібліятэку ДУК «Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (загадчык Лосіч Святлана Паўлаўна) – I месца за шматгранную дзейнасць па арганізацыі прасторы для правядзення вольнага часу дзяцей і падлеткаў, стварэнне ўмоў для развіцця іх творчых здольнасцяў праз работу творчай майстэрні «В гостях у сказки»;

Перхавіцкую сельскую бібліятэку ДУК «Баранавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчкая сістэма» (загадчык Церан Наталля Сяргееўна) – II месца за плённую працу па выхаванні патрыятычных якасцяў у падрастаючага пакалення і фарміраванні прывабнага вобразу вёскі шляхам рэалізацыі краязнаўчага праекта «Родныя вытокі».

2. Пераможцаў абласнога тура XXXII рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» ўзнагародзіць дыпломамі.

3. Прадставіць для ўдзелу ў XXXII рэспубліканскім конкурсе «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»:

Ляхавіцкую цэнтральную раённую бібліятэку імя Я. Купалы ДУК «Ляхавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»;

Маларыцкую цэнтральную раённую бібліятэку ДУК «Маларыцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»;

Столінскую цэнтральную раённую бібліятэку ДУК «Столінская раённая бібліятэчная сістэма»;

Ганцавіцкую цэнтральную раённую бібліятэку імя В.Ф. Праскурава ДУК «Ганцавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»;

Парахонскую сельскую бібліятэку ДУК «Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма».

4. Кантроль за выкананнем рашэння ўскласці на дырэктара Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага Стрыжэвіч А.Я.

Старшыня калегіі,
начальнік упраўлення культуры
Брэсцкага аблвыканкама — С.Б.Панасюк

Республика Беларусь
Управление культуры Брестского исполнительного комитета
РЕСПУБЛИКА БЕЛАРУСЬ